Таццяна Шамякіна

РОЛЯ НАВУКІ Ў СУЧАСНАЙ АДУКАЦЫІ

На працягу савецкага перыяду гісторыі беларускай навукі міфалогіяй, нават у рамках фалькларыстыкі, амаль ніхто не займаўся, міф знаходзіўся на перыферыі навуковых інтарэсаў. Прыкладна з 1980-х гг. сітуацыя кардынальна змянілася. З аднаго боку, у СССР узнікла вострая цікавасць насельніцтва ў цэлым і інтэлектуалаў у прыватнасці да хрысціянства – набліжалася 1000-годдзе Хрышчэння Русі, з другой – таксама і да язычніцкага мінулага нашага народа. Такая цікаўнасць грамадства да праблем, якія раней лічыліся ненавуковымі, звязана не толькі з аб'яўленай Міхаілам Гарбачовым свабодай слова, агульнай дэмакратызацыяй жыцця, але і з эпохай fin de siecle, а тым больш канца тысячагоддзя, адчуваннем змены цывілізацыйнай парадыгмы. Сапраўды, на мяжы XX і XXI стагоддзяў узрастаў інтарэс да духоўных праблем, да таямніц псіхікі, павялічвалася і тэндэнцыя цягнення адно да другога рэлігіі і навукі. Змяніліся і адносіны да міфа. За апошнюю чвэрць стагоддзя ён набыў літаральна ўніверсальны статус, а гэта, у сваю чаргу, абумовіла пераацэнку базісных асноў гуманітарных навук. У 1980-я гады з'явіліся фундаментальныя працы па сувязі міфалогіі і літаратуры такіх выдатных беларускіх даследчыкаў, як акадэмікі Віктар Каваленка і Іван Навуменка.

У пачатку 1990-х гадоў прафесар, член-карэспандэнт НАН Алег Антонавіч Лойка, які ў той час быў дэканам філалагічнага факультэта, дамогся ўключэння дысцыпліны «Славянская міфалогія» ў стандарты навучання і рабочы план дысцыплін філалагічных факультэтаў. Алег Антонавіч мысліў шырока, маштабна і з далёкай перспектывай. Увядзенне ім новай дысцыпліны – сапраўдны прарыў у адукацыі, адкрыццё новага напрамку ў філалагічнай навуцы. Вось прыклад плённага ўдзелу сапраўдных навукоўцаў у вучэбным працэсе! Яны мыслілі стратэгічнымі катэгорыямі, што асабліва відавочна сёння, на адлегласці гадоў.

З таго часу значэнне міфалогіі, нават не язычніцкай міфалогіі як такой, а міфалагічнага мыслення, акрэслівалася ўсё больш выразна. Адзначым толькі некалькі аспектаў, якія закранае дысцыпліна «Славянская міфалогія»:

1. Галоўная цікавасць міфа – Бог і душа чалавека. Асаблівасць міфа ў тым, што ён імкнецца разгадаць тое, што немагчыма разгадаць да канца: Бога, прыроду, космас, нараджэнне і смерць, сэнс жыцця, існаванне ў іншасвеце. Гаворка пра міф, пра рэлігійнае мысленне непазбежна выводзіць на развагі пра лёсавызначальныя для чалавека паняцці і, у рэшце рэшт, садзейнічае замацаванню ў свядомасці студэнтаў сістэмы фундаментальных каштоўнасцей.
2. Міф садзейнічае самавызначэнню этнасаў, фармуе нацыянальную свядомасць. Веданне міфалогіі непазбежна абвастрае нацыянальнае пачуццё.

3. Міф – комплекс уяўленняў, які надае жыццю сэнс. Міф дапамагае асобным людзям, усяму грамадству адэкватна прыстасоўвацца да асяроддзя. Фактычна кожны з нас жыве ў сістэме пэўных кодаў, міфаў, стандартаў.

4. Міфалогія занатавала стасункі чалавека і прыроды. Гэта зведзеныя ў адну сістэму назіранні чалавека над прыродай, максімальна абагулены вопыт. Міф заснаваны на тым, што ў Космасе літаральна ўсё знаходзіцца ў сувязі, а чалавек уключаны ў агульны кругаварот. Такім чынам, «Славянская міфалогія» – такая дысцыпліна, якая дае агульную карціну свету, імкнецца звесці ў адно шматлікія яго складнікі і сваім сінкрэтызмам развівае мозг. Яна таксама дапамагае фармаванню экалагічнага мыслення.

5. Дысцыпліна яскрава дэманструе, што міфалогія з'яўляецца важнейшым падмуркам, асновай культуры чалавецтва: рэлігіі, навукі, адукацыі, мастацтва, быту ў шырокім сэнсе слова.

6. Дысцыпліна стала асновай для фалькларыстыкі, для многіх літаратуразнаўчых вучэбных прадметаў, бо паказвала фармаванне паэтыкі фальклору, узнікненне літаратурнай тропікі, дапамагала ў пошуку этымалогіі многіх слоў.

Статыстыка ВАКа паказвае, што дысертацый па фалькларыстыцы і літаратуразнаўству, якія асноўваюцца на міфапаэтыцы, больш за 80 % з агульнай колькасці работ. Абаранялі дысертацыі людзі, якім чытаўся адпаведны курс у іх вучэбных установах, у тым ліку выпускнікі БДУ. Гэта важны паказчык значнасці навуковага напрамку ў адукацыі. Тым не менш, у 2013 г. пры распрацоўцы новых стандартаў для чатырохгадовага навучання дысцыпліна «Славянская міфалогія» засталася ўсяго толькі як курс па выбары студэнтаў, што можна разглядаць як пачатак канца: дысцыпліна асуджана на вынішчэнне.

Гэта не першы выпадак дзеяння суб'ектыўнага фактару ў вучэбным працэсе. Ён, гэты фактар, можа быць выключна станоўчы, як у выпадку акадэміка Алега Лойкі, а можа быць і безумоўна адмоўным. Адзін з рэктараў БДУ пасля сваёй адстаўкі актыўна, хоць і без поспеху, заняўся палітыкай. Але калі ён яшчэ кіраваў самым прэстыжным універсітэтам краіны, то ліквідаваў надзвычай важную вучэбную дысцыпліну, любімую студэнтамі, – беларусазнаўства. Дысцыпліна давала мінімум ведаў пра прыроду, гісторыю, культуру Айчыны ў комплексе. Той жа рэктар, здзекуючыся са сваёй прафесуры, гаварыў на вучоным савеце, што любы студэнт вышэй на галаву за прафесара, паколькі лепш валодае камп'ютарам. Гэта немагчыма ўявіць, каб доктар педагагічных навук не разумеў розніцы паміж атрыманнем інфармацыі і ведамі!

У сувязі з рэформамі, праведзенымі згаданым рэктарам, нельга не сказаць увогуле пра дзейнасць рэформаў у адукацыі. Вышэйшая адукацыя перажывае чарговую з іх – пераход на чатырохгадовае навучанне. Відаць, гэта на самай справе патрэбна, мэтазгодна, карысна, хоць шырокага абмеркавання не было, чыноўнікі, як заўсёды, думку грамадскасці

праігнаравалі. Менавіта як заўсёды. Ясна, што будуць сэканомлены значныя сродкі, а гэта ўжо нядрэнна. Але што непакоіць?

Вось ужо 25 гадоў сістэма адукацыі ў рэспубліцы пастаянна і надзвычай актыўна рэфармуецца. Зразумела – час пераходны, нестабільны, змены і ў грамадстве адбыліся кардынальныя, але ўсё ж хацелася б ведаць: у імя чаго, у чым вышэйшы сэнс упартых, і не заўсёды народу зразумелых змен (акрамя таннасці)? Інакш кажучы, ці ёсць стратэгія ў адукацыі?

Навучанне моладзі ў антычных Афінах, дзе закладзены асновы класічнай адукацыі на 2500 год наперад, мела на ўвазе гарманічнае выхаванне ў чалавеку разумовых, маральных і фізічных якасцей. Уласна кажучы, тое ж было пастаўлена за аснову ў савецкай школе. А савецкая ж адукацыя прызнана лепшай у свеце. Руская імператрыца Кацярына II, праводзячы шырокія рэформы адукацыі ў краіне, мела на ўвазе шчасце чалавека. Так і было ёю сказана: атрымоўваць веды неабходна, каб быць шчаслівым. Што можа быць больш важным, і ці не ў гэтым вышэйшы сэнс? Бо веды самі па сабе самакаштоўныя, яны здольныя змяніць чалавека, зрабіць яго жыццё асэнсаваным.

У нас жа мэта ў тым, каб ні ў якім разе не адставаць ад Захаду. Зноў даганяем, як ужо не раз было ў XX ст. Між тым сама заходняя цывілізацыя ў стане дэградацыі, перажывае заняпад. Уключэнне Беларусі ў Балонскую сістэму, якой у многіх краінах Еўропы незадаволены, мае на ўвазе падпарадкаванне нейкім глабальным прынцыпам, распрацаваным невядома дзе і кім. Аднак гэтыя прынцыпы не прадугледжваюць канкурэнцыю з боку беларусаў у агульнасусветнай барацьбе за рынкі і рэсурсы. Абсалютна зразумела, што ў глабальнай сістэме раздзялення працы інтэлектуалы, эрудыты з Беларусі не патрэбныя. Нашы дзеці асуджаны на працу ў сферы паслуг. Уласна сама адукацыя з пафасам аб’яўлена нашымі чыноўнікамі сферай паслуг, што надзвычай крыўдна для педагогаў, бо яны пазбаўляюцца адчування сваёй высокай місіі. А гэта тое, што дазваляла, і нават сёння яшчэ дазваляе, працаваць у многім на энтузіязме.

Сэнс усіх рэформаў у галіне гуманітарных навук ужо сёння бачыцца выразна: адсекчы «лішнія» веды, падпарадкаваць навучанне рацыянальным, практычным, нават камерцыйным, прычым выключна злабадзённым задачам. Баюся, што ў дадзеным выпадку высокія чыноўнікі прама ішлі за абывацелем, які не разумее, што, па-першае, веды ніколі не бываюць лішнімі і заўсёды могуць у жыцці спатрэбіцца; па-другое, рынак працы непрадказальны, і тое, што патрабуецца сёння, можа быць абсалютна незапатрабаваным заўтра, будзе нямодным, неактуальным; па-трэцяе, творчы чалавек патрэбны заўсёды і ўсюды, на любым месцы, а крэатыўную асобу фармуюць якраз тыя дысцыпліны, якія лічацца «лішнімі», якія не прыносяць як быццам бачнай практычнай карыснасці (літаратура, фальклор, сусветная мастацкая культура, філасофія, астраномія, краіназнаўства). Менавіта на аснове фундаментальнай падрыхтоўкі, сапраўднай класічнай адукацыі, можна было б ажыццявіць творчую рэвалюцыю, як гэта было, напрыклад, у Японіі ў 1960-я гады, зрабіць прарыў у навуцы, у тэхналогіях. А ў бяскрылых

людзей, якія не ўмеюць думаць, не знаёмых з гісторыяй культуры, ніякіх іннавацый не можа быць у прынцыпе. Абсалютна відавочна, што для нашых выпускнікоў рыхтуецца ў будучым роля прымітыўных служкаў, пры гэтым апрыёры мяркуецца, што афіцыянту, будаўніку, пакаёўцы на працы ў багатых еўрапейцаў не патрэбныя нейкія высокія матэрыі, веданне класічнага мастацтва – дастаткова з іх і масавай культуры.

У апошнія паўгода грамадскасць Расіі ўпарта, хоць пакуль і без поспеху, змагаецца з рэформамі ў галіне адукацыі і навукі. У СМІ выступалі самыя знакамітыя вучоныя, у тым ліку неаднаразова – лаўрэат Нобелеўскай прэміі Жарэс Алфёраў. Усе яны сцвярджалі: навуковае асяроддзе не можа развівацца ва ўмовах дыктату. Вучонага немагчыма прымусіць зрабіць адкрыццё. Ён павінен знаходзіцца і працаваць у творчым асяроддзі. Сусветна вядомы акадэмік Генадзь Месяц сцвярджае: «Когда люди сами никогда не занимались наукой, то они не понимают, как она организована, не знают, что такое научная и творческая атмосфера. Озарение приходит редко, это явление штучное. То, чем мы занимаемся, можно назвать длинной, трудной, кропотливой работой, в которой иногда вдруг что-то проявляется. Согласно статистике, лишь 4-5% из опубликованного используется на практике. Остальное же является «научным бульоном». Но без него наука не может развиваться».

Аднак навуковыя дасягненні беларускіх даследчыкаў, якія працуюць ва ўстановах адукацыі, намнога больш актыўна выкарыстоўваюцца на практыцы – у вучэбным працэсе. Вядома, што нашы вучэбныя дапаможнікі шырока запатрабаваныя студэнтамі і аспірантамі. І не сакрэт, што гэта адбываецца таму, што многія з вучэбных дапаможнікаў фактычна з’яўляюцца паўнацэннымі навуковымі манаграфіямі – толькі ў выглядзе вучэбных іх яшчэ можна неяк апублікаваць.

Ганебнай з’яўляецца практыка, што на напісанне новых дапаможнікаў гадзіны дацэнту, прафесару даюцца толькі па спецыяльнаму дазволу Міністэрства адукацыі. Між тым, у савецкі час на распрацоўку новай дысцыпліны, на напісанне падручніка аўтаматычна дабаўлялася выкладчыку 200 гадзін. У нас павінны быць бібліятэчныя дні, як у акадэмічных вучоных, і гэта, натуральна, прадугледжвае змяншэнне вучэбнай нагрузкі. Аднак сённяшняя сітуацыя сведчыць пра фактычна звышэксплуатацыю выкладчыкаў з боку бюракратычнага апарату, які зацікаўлены толькі ў сваім выжыванні.

Дырэктар Інстытута акеаналогіі РАН акадэмік Роберт Нігматулін у нядаўнім інтэрв’ю рэзка і катэгарычна, ужо без усялякіх рэверансаў у бок уладаў, заявіў: «Чиновничеству ни в коем случае нельзя вмешиваться в дела науки, культуры и образования». Я яшчэ памятаю час, калі ўсе пытанні адносна рабочых праграм факультэта вырашаліся на вучоным савеце філфака. Сёння такое нават немагчыма ўявіць.

Калі немагчыма абысціся без чыноўнікаў, то яны прызваны дапамагаць творчым людзям – навукоўцам і выкладчыкам – у іх нялёгкай працы. На жаль, атрымоўваецца наадварот. Калі ж для выгляду нас і прыцягваюць для

нейкіх праектаў, скажам, у галіне школьнай адукацыі, то ўсе навацыі, усе выказаныя намі прапановы ўсё роўна павісаюць у паветры. Чыноўнікі маюць іншыя сродкі сцвердзіць сваё, не звяртаючы ўвагі на нейкіх там прафесараў. Так, яны распаўсюджваюць анкеты сярод настаўнікаў. Здаецца, дэмакратычна – на выхадзе атрымоўваем думку большасці. Але, натуральна, настаўнікі зацікаўлены ў адстойванні звыклых ім твораў, каб не перавучвацца, не распрацоўваць новыя ўрокі. У выніку мы маем сёння праграму па беларускай літаратуры, складзеную ў пачатку 1990-х гадоў, калі сітуацыя ў грамадстве была абсалютна іншая. Не дзіва, што школьнікі не ведаюць і не любяць беларускую літаратуру.

Усе вучэбныя праграмы, як быццам, праходзяць значную экспертызу, але ў канечным выніку па іх праходзіцца чыноўніцкая рука, і ў выніку абсалютна ігнаруецца сапраўдная – а яна каласальная – роля прадметаў па літаратуры і культуры ў агульным развіцці школьнікаў і студэнтаў. Тым больш крыўдна, калі гэтую ролю не разумеюць уласныя калегі-філолагі.

Такім чынам, перад навукоўцамі, якія працуюць у галіне адукацыі, паўстае велізарная колькасць праблем, з якімі навуковая карпарацыя вучэбных устаноў па сутнасці застаецца сам-насам. Між тым гаворка ідзе пра далейшае існаванне беларускай нацыі менавіта як нацыі.